адна адзінарная, абломак днішча ад ганчарнага гаршка з лінейным арнаментам. Трупаспаленне адбылося на месцы ў X ст.

Курган 2 дыяметрам 3 м, вышынёй 0,8 м. Насыпаны з культурнага слоя, у якім сустракаецца ляпная кераміка з тоўстымі сценкамі (таўшчыня да 1 см). Адзін чарапок з расчэсамі.

Курган 3 дыяметрам 7 м, вышынёй 0,7 м. Збоку насыпу пад дзірваном на глыбіні 0,3 м раскапана 6 гаршкоў. Яны знаходзіліся на абпаленым грунце, 2 стаялі горлам уверх, астатнія ляжалі бокам. У гаршках рэшткі паленых касцей. Косці знаходзіліся і ў попелавугальнай пляме пад гаршкамі. Знойдзена скроневае кальцо авальнай формы з бронзавага дроту са свабоднымі канцамі, якія крыху заходзяць адзін на адзін. Асаблівую цікавасць уяўляюць 1 ляпны, 5 кругавых гаршкоў, фактура ўсіх іх падобная. Дата ўзнікнення кургана — X ст.

Курган 4 дыяметрам 7 м, вышынёй 0,8 м. Пад насыпам збоку на глыбіні 0,4 м знойдзены разбіты кругавы гаршчок з чырвонай гліны. Каля гаршка асобныя спаленыя косці.

Курган 5 дыяметрам 10 м, вышынёй 1,8 м. Пад насыпам знойдзены рэшткі жалезнага нажа.

Курган 6 дыяметрам 7 м, вышынёй 0,7 м. Насыпаны з гліны. У ім знойдзены кавалак кругавога гаршка з лінейным арнаментам і буйныя вуглі.

Курган 7 дыяметрам 7 м, вышынёй 0,7 м. Насыпаны з гліны. У ім знойдзены кавалак ад ляпнога посуду і некальцыяніраваныя косці чалавека. Збоку насыпу на грунце раздаўлены кругавы гаршчок, побач абломак шкляной пацеркі чорнага колеру і рэшткі нажа. Пад гаршком выяўлена невялікая ямка з трупаспаленнем. Адносіцца да канца X ці пачатку XI ст.

Курган 8 дыяметрам 7 м, вышынёй 0,75 м. Курган пусты.

Курган 9 круглы, паўсферычны, дыяметрам 19 м, вышынёй звыш 3 м. На глыбіні 0,5 м у Пн частцы знойдзена 20 абломкаў керамікі. У насыпе кургана неаднаразова выяўлена ляпная кераміка слоікавай формы, якая мае адносіны да паселішча. Напэўна, тут знаходзілася першапачатковае збудаванне, звязанае з паселішчам трэцяй чвэрці 1-га тысячагоддзя н. э.

Курган 10 вышынёй 1 м, дыяметрам 7 м. У насыпе знойдзены 4 ляпныя чарапкі, адзін з расчэсамі. Знойдзены абломкі кругавога посуду з лінейным арнаментам.

Курган 11 вышынёй 0,7 м, дыяметрам 6 м. У пахаванні 1 — абломкі ад двух гаршкоў, у пахаванні 2 — кавалкі аднаго гаршка. У кургане знаходзіўся другі гаршчок канца X — пачатку XI ст. Яго тулава ўпрыгожана арнаментам, падобным на хвалісты.

Курган 12 вышынёй 0,6 м, дыяметрам 5 м. Знойдзены жалезны нож з патоўшчанай спінкай і 7 абломкаў кругавога посуду XI ст.

У курганным могільніку большасць трупаспаленняў (курганы 1, 3, 4, 9), асобныя пахаванні — трупапалажэнні на гарызонце (курган 10). Гэта адзін з курганных могільнікаў тых часоў, калі адбываўся пераход ад крэмацыі да трупапалажэння.

Курганы з трупапалажэннямі XI — XII стст.

*Слабодка II.* Складаецца з 8 курганоў. У 1974 г. Г. В. Штыхавым тут былі даследаваны два насыпы.

Курган 1 у плане круглы, дыяметрам 11 м, вышынёй 1,35 м. Знойдзены сагнуты жалезны нож, напэўна, наўмысна пашкоджаны пры пахаванні. Знойдзены другі нож, баявая сякера-чакан, бронзавая падкованападобная фібула.

Курган 2 дыяметрам 7 м, вышынёй 1,1 м. На глыбіні 0,85 м рэшткі касцяка, які дрэнна захаваўся. Інвентар адсутнічае.

*Слабодка III.* Трэці курганны могільнік, самы далёкі ад в. Слабодка — за 1,5 км на З ад могільніка 1. У ім 30 паўсферычных курганоў вышынёй ад 0,8 да 1,2 м, але некаторыя насыпы выглядаюць авальнымі. У 1974 г.